13 ЖНІЎНЯ 1999г. ПЯТНІЦА


НАВІНЫ

№91 (622) КОШТ СВАБОДНЫ



ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Михаил Чигирь каяться не намерен



Бывшему премьер-министру Михаилу Чигирю, находящемуся за решеткой с конца марта, очередной раз продлен срок содержания под стражей — до 30 сентября. Министр внутренних дел Юрий Сиваков заявил журналистам, что в отношении Михаила Чигиря возбуждено 12 уголовных дел, по трем из них обвинения уже доказаны и в сентябре "дело Чигиря" будет передано в суд. За комментариями НАВІНЫ обратились к Юлии ЧИГИРЬ.

— Чем мотивировано постановление о продлении срока содержания под стражей?

— Чигирю по-прежнему инкриминируют хищение 1 миллиона долларов, строительство личного дома (мы, якобы, не доплатили фирме "Пуше" за строительство нашего дома, хотя эксперты жилищно-коммунального хозяйства документально подтвердили, что мы произвели полный расчет). Кроме того, в постановлении о продлении срока содержания под стражей указываются номера каких-то 6 уголовных дел, возбужденных, якобы, в отношении Михаила Чигиря. Но ни Чигирь, ни я не знаем, о чем идет речь. Написано, что против Чигиря, Заставнюка (это преемник Михаила Николаевича на должности председателя «Белагропромбанка») возбуждены уголовные дела, и указываются их номера. Я не знаю, что это за дела, равно как ничего мне неизвестно о том, допрашивались ли другие работники банка.

— Выходили ли с вами на связь представители властей?

— Мне постоянно звонят люди, заявляющие, что они действуют от имени президента, и требуют, чтобы Чигирь написал покаянное письмо: что в политику он пошел по ошибке, что больше в политической жизни участвовать не намерен. Меня убеждают в том, что Чигиря не освободят ни европейские структуры, ни силы внутри республики. Что единственный выход для Михаила Николаевича — пойти на поклон к Лукашенко. А с другой стороны, на меня выходят так называемые экстрасенсы. Они пытаются убедить меня, что жизнь мужа висит на волоске, что я не должна давать никаких интервью, не должна ничего говорить о ходе следствия.

— А с самим Чигирем велись разговоры на эту тему?

— Нет, только со мной. Мой муж высказался категорически против покаяния.

— Что обещают Чигирю взамен покаяния?

— Изменение меры пресечения.

— Но не прекращение уголовного дела?

— Нет. А вдруг он выйдет на свободу и вновь займется политикой? Органам выгодно держать Чигиря на крючке.

Интервью взял Рыгор БУЯН

Открытое письмо М.Чигиря читайте на стр.7

Жыхар №1

Аляксандр Лукашэнка зменіць рэзідэнцыю «Дразды» на дачу маршала Цімашэнкі, дзе ёсць бомбасховішча



Фота Ул.ШЛАПАКА

Алесь ДАШЧЫНСКІ

Амаль на працягу года для прэзідэнта Лукашэнкі рыхтавалася новая рэзідэнцыя на былой дачы савецкага маршала Цімашэнкі, якая знаходзіцца непадалёк ад Мінска, ля Астрашыцкага Гарадка. Нядаўна прэзідэнт наведаў гэтую рэзідэнцыю, пра што сведчылі, як сцвярджаюць мясцовыя жыхары, каля дзесяці міліцэйскіх пастоў, выстаўленых на подступах да «асоба ахоўваемай» тэрыторыі.

Новыя апартаменты для першага прэзідэнта, па афіцыйнай версіі, спатрэбіліся ў сувязі з рамонтам каналізацыйных сетак у лукашэнкаўскай рэзідэнцыі, якая месціцца на тэрыторыі элітнага комплекса «Дразды». Займаючы 650 квадратных метраў жылой плошчы на гэтай былой дачы партыйнага функцыянера Пятра Машэрава, прэзідэнт Лукашэнка паспеў пасварыцца са сваімі суседзямі, пасламі заходніх краінаў, якія таксама размяшчаліся на тэрыторыі комплекса. Лукашэнка не захацеў развітвацца з багатым драздоўскім домам са шматлікімі пакоямі і спальнямі, з вялікім басейнам, саўнай, спартыўнымі аб'ектамі. Ва ўсякім разе перадаваць былую дачу Машэрава для іншых патрэбаў ён не збіраецца. ▶

Заканчэнне на стар.8

Литовские встречи

Семен Шарецкий встречался с Валдасом Адамкусом. Позже в Вильнюс наведался Ханс-Георг Вик

Николай ХАЛЕЗИН

Руководитель Консультативно-наблюдательной группы ОБСЕ Ханс-Георг Вик 11 августа посетил Вильнюс и провел встречу с Председателем Верховного Совета Семеном Шарецким. Эта встреча произошла на следующий день после того, как господину Вику был вручен Меморандум оппозиционных политических партий о переговорном процессе.

Тема беседы касалась в основном дальнейших действий Председателя ВС. Семен Георгиевич заявил о том, что не планирует просить политического убежища в соседнем государстве и находится там лишь потому, что руководство Литвы смогло предоставить условия для спокойной работы.

Незадолго до встречи с господином Виком Семен Шарецкий заявил в интервью одному из литовских информационных агентств, что 21 августа планирует подписать указ о принятии на себя полномочий главы государства. Председатель ВС предоставил месяц Александру Лукашенко после даты, когда закончился срок его легитимности, для принятия решения о передаче власти. Безусловно, Лукашенко не примет ультиматума, а, следовательно, начиная с 22 августа де-юре Семен Шарецкий станет исполняющим обязанности президента РБ.

По информации, полученной из наших литовских источников, три дня назад произошла приватная встреча, во время которой литовский президент Валдас Адамкус с супругой принимали чету Шарецких.

Пока в соседней Литве Семен Шарецкий проводил встречи с Хансом-Георгом Виком и Валдасом Адамкусом, белорусские власти объявили состав делегации на переговоры с оппозицией. В список вошли: помощник президента Михаил Сазонов, зам. секретаря Совбеза Валерий Новельский, «палатники» Юрий Кулаковский и Николай Чергинец, министр юстиции Геннадий Воронцов и некто Игорь Андреев. Говорить о том, что представительство является весомым, не приходится. Скорее всего, демократическая оппозиция ответит адекватным составом делегации. ■

ПАЛІТЫЧНАЯ АФІША

ВНИМАНИЕ!

В пикетах участвуют ведущие белорусские политики.

13 августа, 17.00 – 19.00, ул. Есенина, д.10. В пикете участвует Людмила Грязнова

18 августа, 16.00 –18.00, пересечение Городского Вала и ул. Немиги. В пикете участвует Анатолий Лебедько

20 августа, 16.00 –18.00, пр-т Партизанский, д.7. В пикете участвует Виктор Гончар

ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ

Яшчэ адзін Кенэдзі памёр

У Нью-Ёрку ва ўзросце 40 гадоў пасля цяжкай хваробы памёр дваюрадны брат Джона Фітцджэральда Кенэдзі-малодшага па мацярынскай лініі Энтані Радзівіл, вядомы спартыўны тэле- і радыёжурналіст. Нагадаем, што Кенэдзі-малодшы загінуў пару тыдняў таму разам са сваёй жонкай. Як бачым, у клане Кенэдзі, аказваецца, прысутнічае і беларуская галіна – Энтані быў нейкім нашчадкам беларускіх Радзівілаў. На жаль, нам не вядома, ці пакінуў Энтані пасля сябе патомства.

Бліжэй да свабоднага гандлю


Некаторыя краіны былога сацыялістычнага лагера ўжо сёлета могуць папоўніць шэрагі Сусветнай гандлёвай арганізацыі. Гэта Арменія, Грузія, Малдова, Эстонія, а таксама і суседка Беларусі – Літва. Пра гэта было заяўлена падчас слуханняў у Кангрэсе ЗША. Як вядома, членства ў СГА дае краінам магчымасць экспартаваць тавары, сплачваючы мінімальныя пошліны (не больш як 5%). Але адначасова яны не могуць абкладваць імпартныя тавары большымі ўвознымі пошлінамі. Намесніца амерыканскага прадстаўніка на гандлёвых перамовах Сюзан Эсерман падкрэсліла, што Расію сёлета ў СГА не пусцяць.

Расія пакрыўдзілася – яе зноў палічылі нерынкавай краінай. Беларусь жа нават ужо не намагаецца ўступіць у Сусветную гандлёвую арганізацыю – усё роўна не возьмуць.

Падрыхтаваў Расціслаў ПЕРМЯКОЎ

наша свабода

НАДВОР'Е



Сёння ўдзень па рэспубліцы чакаецца пераменная воблачнасць, месцамі кароткачасовыя дажджы, навальніцы, вецер няўстойлівы, 2,7 м/сек., пры навальніцах парывы 12–14 м/сек. **14–15 жніўня** па рэспубліцы чакаецца пераменная воблачнасць. 14 жніўня і ноччу 15-га — месцамі кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Днём 15 жніўня пераважна без ападкаў, вецер пераменных напрамкаў, 3–8 м/сек. Тэмпература паветра 14 жніўня ўначы 9–14, 15 жніўня — 9–14.

Курс наяўнага долара на «чорным рынку»

465 000

ПЯТНІЦА
З МІКАЛАЕМ ХАЛЕЗІНЫМ

Затмение

Весь последний месяц мир говорил только об одном — о солнечном затмении, за которым должен был последовать конец света. Конец света наступил лишь частично, да и то в одной отдельно взятой стране, — той стране, которая распласталась на тысячи километров к востоку от нас.

Вдруг обнаружив в своих краях несвойственное исполнение религиозных обрядов, славянские братья раззудили плечо. Теперь у них опять война. Вроде ничего особенного — война как война. Начали, правда, ее не по правилам, — забыли спросить разрешения у Просроченного Председателя Высшего Совета Союза Беларуси и России. Теперь Председатель не знает, чем помочь славянским братьям. Да и сами братья находятся в замешательстве.

Каждый день замешательства обходится им в десяток свинцовых гробов. Но это ведь пустяки, — в прошлую войну славянских россиян с неславянскими россиянами на гробы едва свинца хватило. В их газетах пишут, что это мероприятие специально начали, чтобы премьера сменить. Если они так премьер-министров меняют, то тяжело представить, что будет в следующем году, когда придет время президента сменить. Нам больше повезло — у нас в экономике полный порядок, и оттого премьер вечный, как солнце. Поэтому, видимо, и войны нет.

Пару месяцев назад соседние генералы совершили невероятное — объегорили все силы НАТО вместе взятые. Покинули свои боевые посты в Боснии и, совершив блиц-криг, захватили аэропорт в Приштине. После этого героического поступка понавешали друг другу орденов на грудь, звезд на погоны и стали жить припеваючи, получая немаленькие зарплаты в совершенно свободно конвертируемой валюте. Только во время солнечного затмения выяснилось, что марш-бросок надо было совершать прямиком на родину. Там, правда, зарплата поменьше, но зато работы побольше.

Иногда бросишь взгляд в ту сторону, где солнце восходит, и кажется, что у нас все не так уж и плохо — людей мало без вести пропадает, бизнесменов пока не всех посадили, инфляция всего лишь 20% в месяц... Одна беда — солнечное затмение длится уже пять лет.

ФОТАРЭПАРТАЖ

«Шлюбны саюз» Сонца і Месяца

11 жніўня, з 12 гадзінаў 45 хвілінаў да 15 гадзінаў 15 хвілінаў, жыхары Беларусі мелі магчымасць назіраць частковае сонечнае зацьменне. Паверхня свяціла, закрытая Месяцам у максімальнай фазе, вар'іравалася ад 71 (у паўночна-ўсходніх раёнах рэспублікі) да 86 працэнтаў (у паўднёва-заходніх).

Паводле інфармацыі з міністэрства надзвычайных сітуацыяў, ніякіх сур'ёзных здарэнняў у перыяд зацьмення не адбылося. ■

● Так выглядала сонечнае зацьменне ў Мінску

● Сучаснікі рэдкага нябеснага цуду

СУДОВЫ ПРАЦЭС

Дачка абароніць бацьку

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

Па справе Васіля Лявонава, якая будзе разглядацца ў аўтораку ў Вярхоўным судзе Беларусі, улады дазволілі выступаць у якасці грамадскага абаронцы ягонай дачцэ Святлане.

Святлана амаль кожны дзень бачыцца з Васілём Лявонавым, і яна ўжо цалкам азнаёмілася са зместам заключэння. Сама справа налічвае 37 тамоў. Па справе праходзіць каля 200 чалавек сведак. У якасці зброі фігуруюць 59 патронаў да карабіна Вінчэсцер і 7 да аўтамата СКС. Родныя Лявонава лічаць, што патроны ім былі падкінутыя ўладамі, паколькі ніякай зброі ў іхным доме не было. Следства сцвярджае, што Васіль Лявонаў неаднаразова атрымліваў ад Васіля Старавойтава хабар у выглядзе дзесяткаў кілаграмаў мяса, каўбасаў, рыбы і памідораў. «Навошта сям'і з пяці чалавек такая колькасць прадуктаў, тым больш, што ў нас ёсць свой прысядзібны ўчастак з градамі і парнікамі, дзе растуць памідоры?» — спытала дачка Васіля Лявонава Святлана. Гэтае пытанне яна задавала і следчым, але адказу так і не атрымала. Паводле запісу ў следчым пратаколе, «у студзені 1996 г. Лявонаў у знак падзякі за атрыманы хабар навязаў Старавойтаву крэдыт для ЗАТ «Рассвет» на суму 30 млрд. рублёў для закупкі фуражнага зерня». Можна сабе толькі ўявіць, як «злодзей» Лявонаў у знак падзякі круціць рукі старому і заслужанаму чалавеку ды патрабуе ўзяць 30 мільярдаў, а Старавойтаў крычыць і адмаўляецца браць грошы. Падобных пасажаў у матэрыялах лявонаўскай справы нямала, таму абаронцы экс-міністра пасля пачатку працэсу, які, відаць, будзе вельмі працяглым, збіраюцца ўказаць суддзі Чартовічу на шматлікія парушэнні закона, допушчаныя следчымі. ■

Што скажа Феміда?

Мікола ВАЙТОВІЧ

Бацькі трох дзяцей, якія загінулі падчас трагедыі ў пераходзе станцыі метро «Няміга» і пацярпелага ў гэтай цісканіне, абскардзілі рашэнне суда, які прыпыніў разгляд справы аб матэрыяльнай кампенсацыі маральнага ўрону. Вінаватыя ў гібелі дзяцей, арганізатары масавай забавы павінны ў адпаведнасці з іскам заплаціць па 4 мільярды рублёў. Суддзя Вольга Гусакова прыпыніла разгляд справы ў сувязі з расследаваннем крымінальнай справы па факце гібелі дзяцей. Аднак у той жа дзень у інтэрв'ю беларускаму тэлебачанню прэзідэнт Лукашэнка заявіў, што следства ўжо скончылася і ўсе абставіны трагедыі вядомыя. Пагэтаму прадстаўнікі гарадскіх уладаў, якія з'яўляюцца адказчыкамі па справе, на думку пацярпелых, «увялі ў зман суд». Акрамя таго, істцы не бачаць падставаў для адхілення іхняга хадайніцтва аб прадстаўленні ў суд прашэнняў аб адстаўцы, якія падавалі высокапастаўленыя чыноўнікі. Бацькі загінуўшых дзяцей лічаць, што суд быў зацікаўлены ў адхіленні гэтага хадайніцтва. Акрамя таго, суд не запатрабаваў у адказчыка гарадскога ўпраўлення ўнутраных справаў неабходных пацверджанняў таго, што справа знаходзіцца ў крымінальным судаводстве. Па словах пацярпелых, «фармулёўкі, за якімі схаваўся суд, проста ганебныя».

Кіраўнік грамадскай арганізацыі «Прававая дапамога насельніцтву» Алег Волчак сказаў, што яшчэ 20 бацькоў дзяцей, загінуўшых на Нямізе, гатовыя падаць іскі ў суд аб кампенсацыі маральнага ўрону. Асірацелыя бацькі хочуць ведаць, што скажа Феміда пра смерць іхніх дзяцей. ■

ЦЫТАТА НУМАРА

Я все равно возьму Буйнахск.

Хаттаб
Программа «Сегодня», НТВ, 11 августа 1999г.

Беларусь — у «чорнай дваццатцы»

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

Уплывовая міжнародная арганізацыя «Рэпарцёры без межаў» апублікавала спіс 20 краінаў, урады якіх не дазваляюць сваім грамадзянам свабодна карыстацца Інтэрнэтам. Сярод гэтай «чорнай дваццаткі» знаходзіцца і Беларусь.

Як адзначаецца ў каментары да гэтага спісу, аўтарытарны ўрад Аляксандра Лукашэнкі, вядомы сваім рэпрэсіўным падыходам да іншых сродкаў масавай інфармацыі, не дазваляе грамадзянам Беларусі свабодна карыстацца сусветнай сеткай. Доступ у Інтэрнэт у Беларусі магчымы толькі пры пасрэдніцтве дзяржаўнага манапаліста — «Белпак». Разам з нашай краінай у спіс «Рэпарцёраў без межаў» трапілі краіны Сярэдняй Азіі, Азербайджан, В'етнам, Бірма, Лівія, Ірак, Іран, Паўночная Карэя, Кітай, Саудаўская Аравія, Сірыя, Судан, Туніс, Сьера-Леонэ і Куба. Як бачна, кампанія падабралася адпаведная.

Прадстаўнікі міжнароднай журналісцкай арганізацыі адзначаюць, што сістэма Інтэрнэт неадназначна ўспрымаецца аўтарытарнымі рэжымамі. З аднаго боку, ён дазваляе людзям карыстацца свабодай слова на беспрэцэдэнтным узроўні і таму стварае пагрозу ўладам недэмакратычных краінаў. Але, з другога — Інтэрнэт з'яўляецца значным фактарам эканамічнага росту, і ім часта карыстаюцца пасрэднікі ў гандлі. ■

Віктара Ганчара зрабілі невыязным

Юрый ПАЦЁМКІН

Пашпартна-візавая служба Мінгарвыканкама анулявала дазвольны запіс на выезд за мяжу першага намесніка старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання Віктара Ганчара.

Віктар Ганчар паведаміў, што гэтай падзеі папярэднічалі неаднаразовыя наведванні ягонай кватэры супрацоўнікамі міліцыі, якія настойліва патрабавалі аддаць ім пашпарт. Пазбаўленне магчымасці выезду за мяжу, паводле слоў В.Ганчара, непасрэдна звязанае з узбуджанай у дачыненні да яго вясной бягучага года крымінальнай справай па артыкуле 190 Крымінальнага кодэкса РБ (самавольнае прысваенне звання або ўлады службовай асобы), які цягне пакаранне да двух гадоў пазбаўлення волі або двух гадоў папраўча-працоўных работаў. Пра гэта, паводле ягоных слоў, ёсць прамое ўказанне ў паведамленні пашпартна-візавай службы. «Наколькі я разумею падаплёку, — сказаў В.Ганчар, — улады вельмі баяцца таго, што цяпер рыхтуюцца мае афіцыйныя візіты ў шэраг краінаў, і, верагодна, разумеючы, што пры наяўнасці візы я змагу з'ехаць з краіны, ... яны робяць усё для таго, каб магчымасці для арганізацыі гэтых візітаў прадухіліць». ■

Барацьба за праспект

Наталля ВАЛАКІДА

Таварыства беларускай мовы звярнулася да мэра Мінска Уладзіміра Ярмошына з просьбай прыняць прадстаўнікоў ТБМ. На сустрэчы яны маюць намер высветліць лёс праспекта Францішка Скарыны пасля «выказвання прэзідэнта аб магчымым перайменаванні праспекта» і перадаць асабіста ў рукі подпісы людзей, якія пратэстуюць супраць гэтага.

Такую прапанову Лукашэнка, як вядома, выказаў у траўні падчас наведвання будаўніцтва Палаца Рэспублікі на праспекце Ф.Скарыны. Лукашэнка, нагадаем, вёў размову пра «еўрапейскае аблічча» сталіцы. «Мы зрабілі выснову, што Скарына для нашага прэзідэнта, мабыць, недастаткова еўрапеец, — сказаў кіраўнік справаў ТБМ Сяргей Кручкоў. — У яго ёсць жаданне зрабіць еўрапейскі праспект па еўрапейскім узоры. А што галоўны праспект носіць прозвішча чалавека, вядомага ва ўсёй Еўропе і свеце, ён чамусьці вырашыў, што гэта не па-еўрапейску. Прапанаваў перайменаваць у праспект Перамогі ці Незалежнасці».

У ТБМ сабралася ўжо каля 500 подпісаў грамадзянаў з усёй Беларусі, якія пратэстуюць супраць перайменавання праспекта. З заявай пратэсту выступілі і севастопальскія беларусы. Аднак, паведамілі ў ТБМ, на звароты і публікацыі ў прэсе афіцыйныя ўлады пакуль не адказваюць. «Таму мы хочам атрымаць дакладную інфармацыю ад Ярмошына, ці ставіцца пытанне з перайменаваннем праспекта афіцыйна, — паведаміў Сяргей Кручкоў. — Бо мы ведаем практыку ў нашай дзяржаве, як прымаюцца ўсе рашэнні. І вельмі занепакоеныя, што ў любы момант праспект будзе перайменаваны і ніхто папярэдне ні з грамадскасцю, ні з навукоўцамі раіцца не будзе. Гэта зробіцца загадам зверху». Падчас сустрэчы са старшынёй гарвыканкама сябры ТБМ збіраюцца ўзняць і пытанне візуальнага афармлення горада. У прыватнасці, высвятленне апошнім часам беларускай мовы з гарадскіх шыльдаў, а таксама памылкі-«ляпы» ў існуючых беларускамоўных надпісах. ■

ТБМ падало заяўкі на правядзенне пікета, які плануецца правесці 1 верасня ў Міхайлаўскім скверы з 17:00 да 19:00 гадзінаў, і мітынгу, запланаванага на 8 верасня на пл.Я.Коласа з 17:00 да 19:00 у абарону беларускай мовы.

Сакратарыят заклікае ўсе суполкі таварыства, а таксама іншыя грамадскія і палітычныя аб'яднанні і ўсіх жадаючых правесці 1 і 8 верасня па месцы жыхарства пікетаванні супраць палітыкі русіфікацыі, якая праводзіцца сённяшнімі ўладамі.

Нагадаем, заяўкі падаюцца ў мясцовыя органы ўлады не пазней чым за 15 дзён да правядзення пікета альбо мітынгу. Даведкі па тэл. 284-85-11.

ПАРТЫІ

«Чыстка» грамадскіх аб'яднанняў працягваецца

Расціслаў ПЕРМЯКОЎ

1 кастрычніка пачнецца ліквідацыя грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партыяў. Пра гэта паведаміў міністр юстыцыі Беларусі Генадзь Варанцоў. Усе гэтыя аб'яднанні будуць ліквідоўвацца ў судовым парадку.

Толькі тады стане вядома, колькі ўсяго палітычных партыяў, грамадскіх арганізацыяў і прафсаюзаў перажылі перарэгістрацыю. Нагадаем, што яна праводзілася ў адпаведнасці з прэзідэнцкім дэкрэтам №2 ад 26 студзеня.

1 жніўня скончыўся апошні тэрмін прыёму дакументаў на перарэгістрацыю, і цяпер міністэрства юстыцыі будзе да 1 кастрычніка разглядаць атрыманыя заявы – іх засталося каля 700.

На сённяшні дзень паспяхова прайшлі перарэгістрацыю 6 партыяў з 27, заявы яшчэ 12-ці разглядаюцца. 9 партыяў адмовіліся перарэгістравацца. Міністр юстыцыі мяркуе, што партыі проста няздольныя выканаць новую «прэзідэнцкую норму» і набраць у свае шэрагі 1.000 членаў (раней было дастаткова 500 чалавек).

З амаль 2,5 тысяч грамадскіх аб'яднанняў заяўкі на перарэгістрацыю падалі 1.537. 54 з іх ужо было адмоўлена. Па словах міністра юстыцыі, асноўныя прычыны, чаму грамадскія аб'яднанні не прайшлі праз «сіта» новых правілаў, гэта недасканаласць іх статутаў. Напрыклад, статуты некаторых арганізацыяў дапускалі магчымасць займацца камерцыйнай дзейнасцю – а гэта недапушчальна. Альбо займацца лячэннем людзей – тут грамадская арганізацыя бярэ на сябе функцыю дзяржаўнага органа (міністэрства аховы здароўя). Некаторыя грамадскія арганізацыі па сваёй сутнасці з'яўляюцца рэлігійнымі. Таму мінюст адмаўляе ім у рэгістрацыі і прапануе зарэгістравацца ўжо ў камітэце па справах рэлігіяў і нацыянальнасцяў.

Як паведаміў міністр юстыцыі, новы Грамадзянскі кодэкс, які пачаў дзейнічаць з 1 ліпеня гэтага года, забараніў юрыдычным асобам браць удзел у дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў. А пакуль што да 60% грамадскіх арганізацыяў маюць сярод сваіх заснавальнікаў юрыдычных асобаў. Апроч таго, паводле новых правілаў, грамадскія аб'яднанні мусяць мець фіксаванае членства. Гэта значыць, што калі раней можна было проста запісаць у статуце – у арганізацыі ёсць паўтары тысячы чалавек, то цяпер неабходна пацвердзіць наяўнасць «штыкоў» спісам для праверкі.

Генадзь Варанцоў зазначыў, што новы Грамадзянскі кодэкс таксама забараняе грамадскім аб'яднанням выкарыстоўваць у сваёй назве словы «нацыянальны» і «народны». Каб гэтая норма пачала дзейнічаць, Нацыянальнаму сходу трэба прыняць папраўкі да Закона аб грамадскіх аб'яднаннях. Гэтыя папраўкі ўжо прынятыя ў першым чытанні, а калі будуць прынятыя ў другім і падпісаныя А.Лукашэнкам, то міністэрства юстыцыі будзе прапаноўваць Беларускаму Народнаму Фронту і партыі БНФ змяніць назву. ■

ТЭНДЭНЦЫІ

Стань побач

Зміцер БАНДАРЭНКА, сябра аргкамітэта Хартыі'97

Нягледзячы ні на што, беларуская апазіцыя застаецца адным з самых моцных еўрапейскіх дэмакратычных рухаў, якія змагаліся з дыктатарскімі рэжымамі ў пасляваенны час.

Канец камунізму

Неаднаразова даводзілася сутыкацца з меркаваннем, што апазіцыя на Беларусі слабая, раз'яднаная і нічога сур'ёзнага дыктатуры супрацьпаставіць не можа. Яшчэ пару гадоў таму сам прытрымліваўся падобнага погляду. Аднак сустрэчы з дзеячамі еўрапейскіх антытаталітарных рухаў радыкальна змянілі ацэнку моцы беларускай апазіцыі. Сёння я перакананы ў тым, што беларускія дэмакратычныя сілы з'яўляюцца нармальнай здаровай часткай адзінага еўрапейскага дэмакратычнага руху.

Зараз ва ўсім свеце адзначаюць дзесяць гадоў развалу камуністычнай імперыі ў Еўропе – перамога «Салідарнасці» і венгерскіх дэмакратаў на выбарах у свае парламенты; разбурэнне Берлінскай сцяны; «аксамітная» рэвалюцыя ў Чэхаславакіі; рэвалюцыя ў Румыніі і расстрэл Чаўшэску. Гэтыя падзеі назаўсёды знішчылі чырвоны колер з мапы Цэнтральнай Еўропы. Сістэма, якая існавала дзесяцігоддзі, рухнула амаль у адначассе. Сітуацыя ў краінах, дзе ў 89-м годзе адбыліся антытаталітарныя рэвалюцыі, была вельмі стракатай. Але амаль паўсюль яе вызначалі апазіцыйныя рухі і групы. Паспрабуем параўнаць іх з сучаснай беларускай дэмакратычнай апазіцыяй.

Калі б Папам быў беларус...

Да вядомых падзеяў у Румыніі пра апазіцыю Чаушэску нічога не было чутно. Большасць аналітыкаў і сёння не ўзгадваюць пра нейкі апазіцыйны румынскі рух. Пануе думка, што да змены рэжыму ў Бухарэсце прыклалі руку спецслужбы як Захаду, так і Усходу. Яны зрабілі стаўку на групу незадаволеных праўленнем клана Чаушэску румынскіх генералаў і партыйных наменклатуршчыкаў.

Я быў вельмі здзіўлены, калі даведаўся ад Яна Урбана, аднаго з лідэраў чэхаславацкай Хартыі-77, што ў канцы 80 гадоў у 15-мільённай краіне актыўна дзейнічалі 60 дысідэнтаў і каля 500 іх прыхільнікаў. Мой шок быў выкліканы тым, што куміры з Хартыі-77 у той час былі слабейшымі за нас – сённяшніх беларускіх дэмакратаў. Урбан таксама распавёў, як у ліпені 1989 года да іх прыехаў Адам Міхнік, які ўжо стаў дэпутатам Сейма. Чэхі смяяліся з прадказання героя польскай «Салідарнасці», што ўжо праз год у Празе нельга будзе ўбачыць ніводнай чырвонай зоркі: "Тут — не Польшча! Мы не палякі!". А ўжо праз чатыры месяцы чэхаславацкія дысідэнты фарміравалі кааліцыйны ўрад.

Сіла апазіцыі складаецца з двух фактараў: **моцы дыктатуры**, той брутальнасці, якую яна можа сабе дазволіць у адносінах да сваіх грамадзянаў, і **актыўнасці самой апазіцыі**, якая залежыць ад унутранай падтрымкі і міжнароднай салідарнасці. Таму магу сцвярджаць, што беларускія апазіцыянеры мацней за сваіх калегаў з колішняй ГДР. Там дзейнічала ўсёвідушчая «Штазі», якую прызнавалі адной з лепшых спецслужбаў свету і якая мела дасье на кожнага ўсходнегерманскага жыхара. Апазіцыйныя рэжыму Хонэкера групы і марыць не маглі пра рэгулярнае правядзенне шматтысячных забароненых акцыяў пратэсту і маніфестацыяў кшталту нашага «Чарнобыльскага шляху», правядзенне якіх беларускія ўлады вымушаны дазваляць.

Хутчэй за ўсё, сённяшняя беларуская апазіцыя саступае толькі тагачасным польскай «Салідарнасці» і дэмакратычнаму руху Венгрыі. Але нельга забываць, што істотную, а можа вырашальную падтрымку венгерскай апазіцыі аказаў яе зямляк Джордж Сорас. А палякі, акрамя дапамогі Сораса і амерыканскіх прафсаюзаў АФТ-КПП, мелі духоўную, што яшчэ важней, падтрымку Папы Яна Паўла II. А шмат хто кажа, што не толькі Польшча, але і ўся Еўропа абавязаная збаўленнем ад камуністычнай пагрозы першаму польскаму пантыфіку. Беларусы-каталікі толькі зараз займелі свайго кардынала. Фактычна дзяржаўнай на нашай зямлі і сёння застаецца памесная царква іншай краіны.

Аднак, саступаючы ў масавасці польскаму і венгерскаму рухам, беларускія дэмакраты і на іх фоне выглядаюць прыстойна. 40-тысячны «Чарнобыльскі шлях-96», серыя шматтысячных акцыяў у вясну 1997 года, штогадовыя масавыя святкаванні Дзён Канстытуцыі, Волі і Незалежнасці, 110 тысяч подпісаў пад Хартыяй'97, шырокая палітычная кампанія па выбарах прэзідэнта, выхад 5 тысяч чалавек 21 ліпеня на Цэнтральную плошчу, нягледзячы **на забарону і запалохванні** ўладаў, — усё гэта дэманструе свету, што на Беларусі дзейнічае моцная, добра арганізаваная дэмакратычная апазіцыя.

Дэмбель непазбежны

Гісторыя паказвае, што абсалютная большасць еўрапейскіх народаў аддалі перавагу дэмакратыі. Дыктатуры ў Еўропе сталі недарэчным выключэннем. Апошнія два дыктатарскія рэжымы Мілошавіча і Лукашэнкі абавязкова ляснуць у бліжэйшы час. Чым выкліканая затрымка?

З сербамі ўсё зразумела — мясцовая апазіцыя не вытрымала спакусы вялікасербскага шавінізму, дзеля якой пайшла на хаўрус з Мілошавічам. Аднак пасля Косава сербскія дэмакраты зрабілі высновы і, заручыўшыся падтрымкай Захаду, ініцыятыву ўжо не страцяць.

Галоўная праблема Беларусі ў тым, што да апошняга часу пра нас у свеце мала хто чуў. Захад заўсёды ведаў, што палякі прагнуць збаўлення ад камунізму і расійскай апекі. Выступленні польскіх рабочых і студэнтаў адбываліся на працягу дзесяткаў гадоў. У венграў быў 56-ы год, у чэхаў – 68-ы. Краіны Балтыі не прызнаваліся дэ-юрэ савецкімі з-за Пакта Молатава-Рыбентропа. Сотні ўкраінскіх патрыётаў і праваабаронцаў у савецкія часы былі прызнаныя Вязнямі Сумлення. Пра дэмакратычную апазіцыю на Беларусі Захад нічога не чуў ні ў 70-ыя, ні ў 80-ыя гады. У вачах цывілізаванага свету беларусы не заслужылі сваёй Свабоды і Незалежнасці.

Кепскую службу саслужыў нам і наш ранейшы назоў на замежных мовах. «Белыя расіяне» – так успрымалі нас да апошняга часу ў свеце. Мне здаецца, што розніца ў падыходах да нашай краіны з боку палітыкаў ЗША і ФРГ тлумачыцца менавіта гэтым. Амерыканская палітычная эліта ўспрымае нашу дзяржаву як Belarus, немцы ж, як няхай і Белую, але частку Расіі – Weissrusland.

«Чорны прамоўшн» Беларусі зрабілі Чарнобыль і Лукашэнка. Цяпер у свеце нас ведаюць. А дзейнасць апазіцыі паказвае, што зыход дыктатуры — толькі справа часу.

Калі мы пераможам?

Можна запярэчыць, што беларуская апазіцыя сёння слабейшая, чым у 1991 годзе, калі дэмакраты самі згубілі перамогу. Адзін з лідэраў беларускіх палітычных групаў Віктар Івашкевіч добра растлумачыў, чаму так сталася: «У пачатку 80-х мы марылі, што калісьці гадоў праз трыццаць камунізм развaліцца, Беларусь стане самастойнай дзяржавай. У 91-ым **нечакана** ўсе мары спраўдзіліся: аб'яўлена незалежнасць, кампартыя забароненая, над Домам урада лунае бел-чырвона-белы сцяг». Гэта быў вырашальны момант, трэба было неадкладна браць уладу. Але фронтаўскія рамантыкі замарудзіліся. І рэваншысты часова перамаглі.

Усе ўзгаданыя дэмакратычныя рэвалюцыі ў Еўропе адбываліся па падобных сцэнарах. Агульнае ў іх наступнае:

— моцныя эканамічныя і палітычныя крызісы;
— эканамічныя санкцыі супраць рэжыму, палітычны ціск на яго з боку дэмакратычных краінаў;
— асноўныя падзеі адбываюцца ў буйных гарадах;
— вырашаецца ўсё ў сталіцы, калі на вуліцы выходзіць больш за сто тысяч незадаволеных грамадзянаў;
— абсалютная большасць пераможных рэвалюцыяў адбываецца восенню.

Надыходзячая восень можа стаць вырашальным выпрабаваннем як для ўладаў, так і для прыхільнікаў дэмакратыі на Беларусі і, асабліва, у Мінску. Нагадаю, што Лукашэнка ў першым туры прэзідэнцкіх выбараў набраў у сталіцы 22% галасоў (сёння яго рэйтынг у Мінску — 24%), за Шушкевіча і Пазняка разам аддалі галасы 43% мінчан (сёння, па сацыялагічных дадзеных, каля 45% жыхароў сталіцы з'яўляюцца цвёрдымі праціўнікамі былога ППРБ).

Ведаючы фінал Чаўшэску, які ні аб чым не хацеў дамаўляцца, Лукашэнка, як раней Ярузельскі, Кадар, вымушаны ісці на перамовы з апазіцыяй. Яго сітуацыя яшчэ горшая. Ён страціў легітымнасць. Шанцы беларусаў на пазітыўныя змены як ніколі высокія. Адказнасць сёння кладзецца як на апазіцыю, так і на «ціхіх» працаўнікоў дыктатуры, якіх толькі ў Мінску каля 800 тысяч чалавек. Пад час перамоўнага працэсу неабходна дапамога вуліцы.

Апошнім часам істотна змяніліся мае стасункі з сябрамі і знаёмымі. Раней яны — прадпрымальнікі, акторы, выкладчыкі — часцяком хлопалі мяне па плячу і з'едліва пыталіся: «Ну што, апазіцыя, калі пераможаце?» Прадпрымальнікі вярталіся з адпачынку на Канарах; акторы былі ўпэўненыя, што ўсё будзе, як у добрыя савецкія часы, калі можна было трымаць фігу ў кішэні і атрымліваць 500 р. ад дзяржавы за прыналежнасць да культурнай эліты; выкладчыкі спадзяваліся, што дацэнт універсітэта заўсёды здолее забяспечыць сям'ю. І хоць усе яны прыстойныя людзі, цвёрдыя «заходнікі» і ненавідзяць дыктатуру, мне як апазіцыянеру даводзілася больш адмоўчвацца.

Але прайшоў час. Прадпрымальнікі шэптам абмяркоўваюць, каго з калегаў-бізнесменаў пасадзілі, а ў каго толькі арыштавалі рахунак фірмы і забралі маёмасць. Артысты, падпрацоўваючы, дзе толькі магчыма, атрымліваюць на рукі чэсна зароблены 30 долараў. Некаторыя з выкладчыкаў кінулі настаўніцкую навуку і вымушаны зарабляць вазніцтвам.

Цяпер я ўжо не маўчу, калі нападаюць на Шарэцкага ці Грыба. Беларускія апазіцыянеры, дэпутаты Вярхоўнага Савета, лідэры апазіцыйных партыяў і рухаў, шараговыя актывісты, журналісты незалежных СМІ сёння маюць права сумленна глядзець у вочы людзям, а на пытанні сваіх дзяцей заўтра шчыра адкажуць: «Я рабіў памылкі, часам мне было страшна, але я змагаўся з рэжымам!»

Усе, хто не хоча быць рабом у сваёй краіне, хто хоча жыць годна і не хлусіць сабе і дзецям, можа зрабіць тое самае. Гэта не цяжка. Трэба проста стаць побач. І мы пераможам. ■

ГОЛАС ВУЛІЦЫ

— Аляксандр Лукашэнка надае вельмі шмат увагі ўборачнай: ён сам на верталёце аблятае палі, за кожнай вобласцю замацаваны найвышэйшыя дзяржаўныя чыноўнікі, у тым ліку і міністры. Як вы лічыце, ці ёсць ад усіх гэтых высілкаў хоць нейкі эфект?

Таццяна, студэнтка

— Цяпер людзі вельмі любяць выпіваць на працы, і потым пралёжваюць цэлымі днямі. Калі прэм'ер-міністр будзе сачыць, каб на працы не выпівалі, то тады ўсё будзе добра.

Ігар, вайсковец

— Гэта проста нагнятанне абстаноўкі, я так разумею. Няхай кожны гаспадар сам у сябе разбіраецца, на месцы.

Ірына АНІСОВІЧ, лабарант інстытута генетыкі і цыталогіі

— Будзе добры эфект. Я лічу, што гэта лагічна – тое, што прэзідэнт клапоціцца пра збор ураджаю.

Уладзімір Ежыкаў, дэпутат Калінінградскай абласной Думы

— То, что происходит у вас сейчас, было у нас десять лет назад. Тогда партийно-хозяйственные чиновники посылали клерков поменьше на уборочную страду, а еще раньше — нас, тогда еще студентов. Но от этого не увеличивалось ни количество картофеля, ни количество зерна, мяса и молока. От этого увеличилось только количество чиновников – того аппарата, который паразитировал на теле народа. У вас чистый город – но посмотрите, как бедно народ вокруг живет! Миллионеры с драными штанами. Куда идет эта великая страна с ее великой историей и ее великим, замечательным народом?

Апытанні
Расціслаў ПЕРМЯКОЎ
і Уладзімір ШЛАПАК (фота)

ПОНЕДЕЛЬНИК • 16 АВГУСТА



6.30 Доброе утро, Беларусь!
7.00 Новости.
7.10 Доброе утро, Беларусь!
8.15 Резонанс.
9.00 Новости.
9.10 Потребительская корзина. Социально-экономическая программа.
9.25 «Сегодня с вами...» Народная артистка Беларуси Зинаида Броварская.
9.50 Здоровье. Тележурнал.
10.15 Детский экран. «Сказка о Рыбке». Развлекательно-познавательная программа для маленьких.
11.00 Новости.
11.10 Новые имена.
11.20 **«Верность любви»**. Сериал.
12.05 Теленавигатор.
12.25 Музыка без границ. Музыкально-информационная программа.
13.00 Новости.
13.15 «Экомир». Док. фильм «Африканский ушастый сокол».
13.45 Дневной сеанс. В.Борисов и М.Дюжева в худ. фильме **«На исходе лета»**.
15.00 Новости.
15.15 Сериал для детей. **«Девочка и океан»** (Австралия).
15.40 А.Хачатурян. Симфония N2. Исполнитель - Государственный академический симфонический оркестр Республики Беларусь. Дирижер - Геннадий Проваторов.
16.35 Авто-парк.
16.45 Премьера песни.
17.00 Новости (с сурдопереводом).
17.15 «А музыка звучит...» Концерт художественных коллективов Белорусского университета культуры.
17.50 «Время и люди». Телеочерк о коллективе производственно-коммерческой фирмы «Спутник» (г.Могилев).
18.10 **«Верность любви»**. Сериал.
18.50 Новые имена.
19.00 Новости.
19.15 Политические диалоги.
19.40 Международные спортивные новости.
20.00 Добрый вечер, Беларусь! В программе: «Разговор в прямом эфире», «Что делать?».
20.25 Юмористическая программа «Понедельник с «Христофором».
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Фильмы нашей памяти. Л.Касаткина в худ.фильме **«Душечка»** («Мосфильм»).
23.20 Криминальная хроника.
23.25 Белорусский хит-парад.
23.30 Третий тайм.
24.00 Новости.
0.10 Крок. «Мы одной тебе принадлежим...» Телеочерк об участниках III феста белорусских объединений (Слонимский район).



14.00, 17.00 Новости.
14.15 **«Гарри - снежный человек»**. Сериал.
14.40 Мультсеанс: «Ну, погоди!»-12.
14.55 Звездный час.
15.30 ...До шестнадцати и старше.
16.00 Сериал **«Во имя любви»**.
17.15 «Ералаш».
17.40 Программа «Мы».
18.20 Здесь и сейчас.
18.40 Исторический фильм **«Молодая Екатерина»**. 1-я серия.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.35 Погода.
20.40 Однако.
20.50 Сериал **«Горец - IV»**.
21.50 Взгляд.
22.35 Хоккей. Кубок «Спартака». «Звезды России» - «Спартак».



06.00 Доброе утро, Россия.
06.20 У всех на устах.
06.45 Телеигра «Программа передач».
08.15, 18.00, 22.45 Дежурная часть.
08.45 Товары - почтой.
09.10 **«Миледи»**. Сериал.
10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Вести.
15.30 **«Первые поцелуи»**. Сериал.
16.30 «Башня».
17.00 **«Лето нашей тайны»**. Сериал.
18.30 Почта РТР.
19.40 Подробности.
19.55 Кинокомедия **«Девушка с гитарой»**.
21.40 Акуна матата.
23.30 Автомотоспорт: летнее кольцо.
00.25 Прогноз погоды.



07.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
07.25 **«Вероника возвращается»**. Худ. фильм.
08.45 «Книжный кладезь».
08.55 **«Секретный агент»**. Худ. фильм.
10.25 «Мировая деревня». «Село Столипино и его обитатели».
11.10 «Время, портреты, судьбы». В.Даль.
11.40, 19.50 После новостей...
12.00 «Андрей Житинкин. Скандальный режиссер скандального времени?».
13.45 «Консилиум».
14.10 «Пушкинская тропа».
14.30 «Страна Фестивалия».
15.00, 17.30 Новости.
15.10 «Лукоморье».
15.30 Мультфильмы.
16.05 «Молитва». Док.фильм.
16.35 «15-й подъезд».
17.00 «Мир авиации».
17.40 Спектакль «Горе от ума».
19.00 Мультфильм.
19.10 Чудо-сказка.
